# Фанетыка і арфаэпія

1. *Выпішыце па групах словы, дзе літары е, ё, ю, я, і абазначаюць: 1) галосны гук і мяккасць папярэдняга зычнага; 2) два гукі.*

Ідэйны, саўю, капелюшы, ілюзія, вясковец, вечарына, аб'езд, авіятар, раён, панядзелак, сталяр, цётка, ціхенька, акіян, цюбецейка, яблык, энтузіязм, немінуча, пячора, кроільны, паўшар'е, кмен, заінелы, гніллё, бусляня, аер, Івацэвічы, авёс, клёнік, заваёвы, Бялінскі, юнацтва, маёнтак, мураўіны.

2. *Прачытайце словы. Ахарактарызуйце пазіцыйныя змены зычных.*

а) Прывід,пейзаж,мароз,дуб,гараж,лебедзь,мядзведзь,дождж,агледзь,ромб, гіпноз, калодзеж;

б)прабежка,кладка,дзядзька,салодкі,лыжка,кніжка,грыбкі,нізкі,жэрдка,под піс,цяжка,гладка;

в) айсберг,малацьба,барацьба,футбол,просьба,касьба,лічба,вакзал, экзамен;

г) смеласць, магчымасць, прывезці, пазней, на прызбе, сведка, бясшумны, Мацвей.

3. *Запішыце словы ў транскрыпцыі.*

Адчыніць, не парэжся, параіцца з Грышам, пясчаны, горад, купаешся, падцягнуць, з чэмпіёнам, адчапіць, з жыта, дождж, пад'язджаць, па кладцы, футбол, ракетчык, снедаць, праз чатыры дні, пашыць з шоўку, зрабіць з саломы, дарадчык, лётчык, цётчын, ад світання, смяешся, сцежка, сустрэўся з героем, у вопратцы, аб унучцы, дамовіцца з Жэнем.

4. *Прачытайце прыметнікі, правільна вымаўляючы выдзеленыя спалучэнні зычных. Вымаўленне перадайце праз транскрыпцыю.*

| | | |
|---|---|---|
| гарадскі | нясвіжскі | кіргізскі |
| грамадскі | добрушскі | інгушскі |
| заводскі | латышскі | суседскі |

5. *Па асаблівасцях вымаўлення спалучэнняў зычных гукаў, што абазначаны выдзеленымі літарамі, вызначце і падкрэсліце ў кожным радзе «лішняе» слова.*

Зга**дз**іцца, а**дз**вінець, па**дз**якаваць, па**дз**ея.
А**б**клеіць, пама**г**чы, дзе**ж**ка, лі**ч**ба.
Цюры**хс**кі, францу**зс**кі, латы**шс**кі, варон**жс**кі.
Імкне**шс**я, не парэ**жс**я, вучы**шс**я, ра**сч**эша**шс**я.
Агаро**дж**а, па**дж**ылкі, ура**дж**ай, дрож**дж**ы.
**З**мераць, **з**нішчыць, **з**гінуць, **з**біць.